АЛІМПІЙСКІЯ НАДЗЕІ

# ЧЭМПІЁНЫ З ВЁСКІ

## У аграгарадку Абухаве гадуюць спартсменаў і мараць аб узнаўленні басейна

**Наўрад ці знойдзецца другая такая вёска, дзе б так актыўна займаліся спортам. А як сведчыць закон дыялектыкі, колькасць заўсёды пераходзіць у якасць. Так атрымліваецца і ў Абухаве Гродзенскага раёна. Штогод адсюль выходзяць майстры спорту, пераможцы рэспубліканскіх і міжнародных спаборніцтваў.**



**Мікалай ЯНУШКЕВІЧ з узнагародамі сваіх выхаванцаў.**

### Што за фасадам

Дзіцяча-юнацкая спартыўная школа ў аграгарадку Абухаве з выгляду не такая ўжо і прыкметная. Аднапавярховы будынак больш падобны на прыбудову. Раней тут быў клуб, аб чым нагадваюць пано на сцяне, выкладзеныя з каляровага шкла і кавалкаў люстэрка. Драўляная падлога пафарбавана ў цёмна-чырвоны колер. Цяпер у гэтым будынку займаюцца вольнай барацьбой і знаходзіцца адміністрацыя. Адразу каля ўвахода — кабінет дырэктара. Гаспадар запрашае прайсці ў памяшканне.

— У мяне тут скураных канап няма, я не шыкую, — кажа Мікалай Янушкевіч, — сталы хіба што ад былых гаспадароў засталіся, а мы тут ужо амаль 35 гадоў... Ёсць больш надзённыя патрэбы — форму трэба купіць, спартсменаў аздаравіць. Мы, напрыклад, сваім выхаванцам падчас лагернай змены прапаноўваем чырвоную ікру, шашлык, барбекю...

У калідоры звяртаю ўвагу на стэнды з фотаздымкамі самых славутых выхаванцаў школы. Іх за тры дзесяцігоддзі сабрана некалькі сотняў. Пераможцы рэспубліканскіх, міжнародных спаборніцтваў, удзельнікі Алімпіяды, прызёры Паралімпійскіх гульняў. Але здзівіла сціплае афармленне — ні табе шкляных вітрын, ні партрэтаў у сучасных рамках. А гэта як-ніяк самая лепшая спартыўная школа на ўвесь рэгіён...

І ўсё ж разумею, што галоўнае — гэта ўмовы для заняткаў. А яны тут даволі прыстойныя. Прасторная зала для барацьбы, трэнажоры, адрамантаваныя санвузлы і раздзявальні. Як аказалася, гэта не ўся спартыўная школа. Валейбольная зала пабудавана значна пазней і прымыкае да сярэдняй школы.

— Збіраюся афармляць там вітрыны для нашых узнагарод — кубкаў, медалёў, грамат, — каментуе Мікалай Васілевіч, — бо на маіх стэлажах не хапае месца. Бачыце, колькі іх тут — больш за паўсотні... І гэта далёка не ўсе...

### «Мы прымаем усіх...»

Так адбылося, што самымі папулярнымі ў аграгарадку сталі валейбол і вольная барацьба. Успамінаю, як у школьныя гады захапляліся гэтымі відамі спорту і ў нашай вясковай школе, таксама ў Гродзенскім раёне. Вядома ж, любілі гуляць у валейбол. Памятаю, як аднойчы ў нас з'явіўся трэнер па барацьбе, і амаль усе хлопцы з класа сталі барцамі. Нешта падобнае адбылося і ў Абухаве. Сабраліся аматары спорту, пачысцілі школьны падвал і пачалі трэніроўкі.

— Набіралі малодшых школьнікаў, — успамінае дырэктар спартыўнай школы, — у секцыю ішлі цэлымі класамі. Мы і цяпер прымаем усіх, няхай займаюцца, усё ж лепш, чым за камп'ютарам сядзець...

Хоць і няпроста — адаптаваць дзетак ад гаджэтаў, але трэнер Аляксей Гедройць вельмі добра ўмее гэта рабіць. Кажуць, што ён трэнер «ад Бога» і нейкія запаветныя словы ведае, каб заахвоціць малых да спорту.

— Якія сакрэты? Дзеці бачаць: у нас свая валейбольная зала, тут цікава і можна чагосьці дабіцца, — выказвае сваё меркаванне Аляксей Мечыслававіч. — Яны растуць. Пераходзяць на новы ўзровень...

Каманду па валейболе «Легіён» з Абухава спартыўныя балельшчыкі добра ведаюць, бо яна ўжо некалькі гадоў уваходзіць у вышэйшую лігу і ў мінулым сезоне заняла чацвёртае месца ў чэмпіянаце краіны. Усе ўдзельнікі каманды — выхаванцы мясцовай спартыўнай школы, а некаторыя ўваходзяць у склад нацыянальнай юніёрскай зборнай.

— За тое, што спорт у нас у пашане, трэба падзякаваць раённым уладам, старшыні райвыканкама Яну Васілеўскаму, — адзначае галоўны трэнер «Легіёна». — Можна сказаць, што гэта падтрымка якраз і вывяла нашу школу ў вялікі спорт. Вядома, і наш калгас «Абухава», і прафсаюз АПК выдзяляюць сродкі на развіццё каманды.

Выдатныя вынікі паказваюць і спартсмены-барцы з Абухава. Сямёра з іх уваходзяць у асноўны склад нацыянальнай зборнай.

— У нас кожны месяц па барацьбе медаль, — з гонарам гаворыць Мікалай Янушкевіч. — З Гродзенскай вобласці толькі нашы спартсмены такі высокі вынік паказваюць. У нас чацвёртае месца нават не кацірэуцца, толькі першыя тры.

Мікалай Васілевіч трымае спіс спартсменаў, якія паказалі высокі вынік за апошнія чатыры гады на першынстве Еўропы і свету. Цэлая надрукаваная старонка. Тут і спаборніцтвы ў Польшы, Балгарыі, Славакіі, Сербіі, Швецыі, Грузіі. Цікава, але больш удала выступаюць барцы-дзяўчаты. Напрыклад, мы ў школьныя гады і не ўяўлялі сабе такіх гурткоў. Валейбол — калі ласка, з задавальненнем, а каб барацьбой займацца... Як аказалася, дзяўчаты і гэты від алімпійскі спорту адолелі.

— Раней я і сам думаў, што гэта не жаночы спорт, але цяпер бачу — дзяўчаты робяць барацьбу эфектнай. Выходзяць такія прыгожыя, з баявым запалам, — усміхаецца Мікалай Васілевіч. — І перамагаюць!

### Усе на спартакіяду! Вясковую...

Калі Абухава — самы спартыўны ў рэгіёне аграгарадок, то сям'я Курыштаў — самая спартыўная ў акрузе. З пяцярых дзяцей трое — майстры спорту.

З бацькам сямейства мы сустрэліся на цэнтральнай плошчы аграгарадка. Дзмітрый Іванавіч прыехаў з суседняй вёскі, што за некалькі кіламетраў ад Абухава. Падцягнуты, загарэлы — ні табе жывата, ні лішніх кілаграмаў. Каб захаваць добрую форму, раіць больш працаваць і адмовіцца ад тытуню і алкаголю. Сам ён даўно іх не ўжывае. З бацькі, відаць, узялі прыклад і дзеці.

— Яны ў мяне дарослыя. У некаторых свае сем'і, працуюць, як і мы з жонкай, у калгасе. Але ўсе фанаты спорту, — расказвае Дзмітрый Курышта. — Найбольшых поспехаў дасягнулі мае двайняты — Саша і Насця. Цяпер у сталіцы трэніруюцца перад чэмпіянатам свету, будуць выступаць за зборную краіны.

Бацька расказаў, што Насця стала майстрам спорту ў 16 гадоў. Цяпер яна з братам вучыцца ў гродзенскай школе алімпійскага рэзерву, неадназова выходзіла прызёрам на міжнародных спаборніцтвах, атрымлівае імянную прэзідэнцкую стыпендыю ў сферы фізічнай культуры і спорту.

Дзмітрый Іванавіч успомніў, як сам некалі хадзіў на заняткі ў той самы школьны падвал. Зараз умовы значна лепшыя. Усе трэнеры апантаныя сваёй справай — таму і вынікі ў выхаванцаў добрыя. Ды і сам шматдзетны бацька не супраць размяцца. Сабраў такіх жа аматараў, разам абсталявалі пляцоўку пад спартыўныя гульні. Трава на гэтым полі не расце, бо тут заўсёды ёсць каму мяч паганяць.

А яшчэ ў Абухаве папулярная мясцовая спартакіяда. Камандаў набіраецца нямала, яны спаборнічаюць у валейболе, настольным тэнісе, дартсе, рыбнай лоўлі. Пераможцаў калгас і прафсаюз узнагароджвае кубкамі і грашовымі прэміямі. Дзмітрый Іванавіч і яго дзеці, што працуюць у калгасе, заўсёды гатовы свае спартыўныя здольнасці паказаць. Такім чынам, у кожнага ў сям'і Курыштаў ёсць свая спартыўная арэна.

### Ці запрацуе басейн?

Пры тым што аграгарадок кідае выклік вялікаму спорту, сам населены пункт губляе важныя спартыўна-аздараўленчыя аб'екты. Вось ужо некалькі гадоў, як у Абухаве перастаў працаваць басейн. Некалі яго будаваў калгас, але затым аб'ект перадалі на баланс раёна. Спачатку тут планавалі правесці рамонт, але тэрмін рэканструкцыі зацягнуўся...

— Столькі дзяцей і дарослых сюды раней хадзілі, з навакольных вёсак цэлымі класамі прыязджалі, — успамінае дырэктар дзіцячай спартыўнай школы Мікалай Янушкевіч, — і вынікі добрыя на спаборніцтвах былі па плаванні. А галоўнае — дзецям са скаліёзам, іншымі захворваннямі гэта вельмі дапамагала. А зараз у раёне няма ніводнага басейна.

Па праўдзе кажучы, ва ўсёй вобласці толькі некалькі басейнаў дзейнічае. Вось і тут, у Абухаве, моцны з выгляду будынак у самым цэнтры аграгарадка пустуе. А між іншым, населены пункт трапіў у прэтэндэнты на атрыманне статусу «аграгарадок будучыні». У дзіцячай спартыўнай школе спадзяюцца, што ў сувязі з гэтым будзе звернута ўвага і на стан басейна.

Разам з тым ёсць планы па будаўніцтве стадыёна. Але ці патрэбны ён тут? — задаецца пытаннем Мікалай Васілевіч. І прапаноўвае сваё бачанне развіцця спартыўнай інфраструктуры.

— Перад нашай школай дзве роўныя пляцоўкі. Можна ўладкаваць на адной тэнісны корт, на другой — у валейбол, напрыклад, гуляць. Ёсць месца і для дзіцячага гарадка, зімой можна коўзанку заліваць. І школьнікам зручна — школа сярэдняя побач, каб урокі фізкультуры тут праводзіць. Ёсць прыстасаваныя раздзявальні.

Новая інфраструктура дала б магчымасць азеляніць наваколле. Пакуль гэта цяжка зрабіць з-за нявызначанасці тэрыторыі.

Праект аграгарадка будучыні толькі фарміруецца, але ёсць падставы меркаваць, што пажаданні жыхароў населенага пункта будуць улічаны.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
margo@zviazda.by

### У ТЭМУ:

Адвячоркам удалося звязацца па тэлефоне з Насцяй Курыштай — адной з самых маладых, але тытулаваных спартсменак з Абухава. Цяпер яна знаходзіцца ў сталіцы на зборах, а ў канцы ліпеня прыме ўдзел у юніёрскім чэмпіянаце свету ў Фінляндыі. Пагаварылі пра яе трэніроўкі, планы на будучыню. Пакуль 18-гадовая дзяўчына думае застацца ў спорце. Усе ж такі з шасці гадоў займаецца вольнай барацьбой дзякуючы першаму трэнеру Юрыю Борчанку. Свой выбар тлумачыць сямейнай справай, а таксама добрымі ўмовамі для развіцця гэтага віду спорту. Не выключае і ўдзел у Алімпійскіх гульнях. Праўда, не ў наступных 2020 года ў Токіа, а, можа, крыху пазней.

**ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ**
гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в дер. Сосновая, ул. Придорожная (участок №2), дер. Малое Залужье (по генплану №10), дер. Лужки, ул. Банная (участок №6), дер. Дуброва (участок №1) Озерицко-Слободского сельсовета Смолевичского района Минской области

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Форма проведения аукциона | Открытый |
| 2 | Дата, время и место проведения аукциона | 31 августа 2017 года, в 11.00, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27, Озерицко-Слободской сельисполком, зал заседаний |
| 3 | Продавец и его адрес | Озерицко-Слободской сельисполком, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27 |
| 4 | Земельный участок, его кадастровый номер и адрес | **Лот № 1** — площадь 0,1407 га №624883010101000546 дер. Сосновая, ул. Придорожная (участок № 2); **Лот № 2** — площадь 0,1491 га №624883006601000126 дер. Малое Залужье (по генплану № 10) **Лот № 3** — площадь 0,1369 га №624883005601000174 дер. Лужки, ул. Банная (участок № 6) **Лот № 4** — площадь 0,1473 га №624883003801000311 дер. Дуброва (участок № 1) |
| 5 | Условия продажи | Без изменения целевого назначения |
| 6 | Целевое назначение земельного участка | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10904 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) |
| 7 | Начальная (стартовая) цена продажи | **Лот №1** – 30000 рублей **Лот №2** – 10000 рублей **Лот №3** – 20000 рублей **Лот №4** – 30000 рублей |
| 8 | Условия аукциона | А) продажа по цене не ниже начальной; Б) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь постоянно проживающие на территории республики; В) без права предоставления рассрочки; |
| 9 | Наличие инженерной инфраструктуры | дер. Сосновая, ул. Придорожная (участок № 2) – подъездные пути, газ дер. Малое Залужье (по генплану №10) – подъездные пути, электричество дер. Лужки, ул. Банная (участок № 6) – подъездные пути дер. Дуброва (участок №1) – подъездные пути, электричество, газ |
| 10 | Ограничения в использовании | Лот №4 — водоохранная зона реки, водоема |
| 10 | Условия оплаты | За безналичный расчет в течение 10 рабочих дней после подписания протокола по результатам проведения аукциона |
| 11 | Сумма задатка и реквизиты продавца | 10% от начальной (стартовой) цены земельного участка р/с BY50AKBB36410000006146200000 БИК AKBBBY21612 в филиале 612 ОАО «АСБ Беларусбанк» ЦБУ 621 г. Смолевичи УНП 600046563 (с пометкой «задаток за земельный участок») |
| 12 | Порядок предв. ознаком. в натуре с земельными участками | Среда в 10.00 |
| 13 | Прием документов | В рабочие дни: понедельник, вторник, среда, четверг, пятница с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 |
| 13 | Окончательный срок приема документов | 25 августа 2017 года в 17.00 ч |
| 14 | Контактный телефон | 8-01776- 44-636, 68-030 |

Расходы по организации и проведению аукциона: **лот №1 — 1482,69 руб., лот №2 — 1574,31 руб., лот №3 — 1555,47 руб., лот №4 — 1672,48 руб. и публикация информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.**

**Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо предоставить:**

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков).

Физическим лицам — документ, удостоверяющий личность (паспорт) и копию паспорта покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае если интересы покупателя представляет это лицо).

3. Счет в банке, на который перечисляется сумма возвращаемого задатка.